**Палулех, З.** Загартоўка на ўсё жыццё / З. Палулех // Браслаўская звязда. — 2013. — 27 лістап. — С. 2.

## ЗАГАРТОЎКА НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ



**Дваццаць пяць гадоў аддзяляе нас ад даты вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Гэта на пяць гадоў больш, чым было многім юнакам, якія з мірнага спакойнага жыцця трапілі ў самае пекла вайны. У ліку іх і Часлаў Ленскі (на здымку) з Відзаў.**

Пасля заканчэння школы ён пайшоў вучыцца ў вучылішча ў Наваполацку, адкуль і быў прызваны на службу ў армію. Фізічна загартаваны хлопец, як і многія яго равеснікі, лічыў за гонар служыць у ваенна-дэсантных войсках. Так яно і атрымалася. Але быў гэта пачатак 80-ых, калі ўжо шла вайна ў ДРА.

Дэсантнікі 103-яй Гвардзейскай дэсантнай дывізіі, што дыслацыруецца ў Віцебску, аднымі з першых былі накіраваны ў далёкую, выпаленую сонцам краіну. У многіх аперацыях ім адводзілася роля асноўнай ударнай сілы. Гвардзейцы-віцябчане дзейнічалі заўсёды мужна і ўмела, хутка асвойваліся з незнаёмым ім дагэтуль тэатрам ваенных дзеянняў.

У тым, што новае папаўненне таксама рыхтуюць да адпраўкі на вайну, ніхто з навабранцаў і не сумняваўся. Праўда, уявіць сабе, што тэта такое, ніхто не мог. Але цягнулася такое няведанне нядоўга. Адразу пасля курса маладога байца іх адправілі ў Афганістан.

Аэрапорт Кабула сустрэў неймавернай спякотай. Пятнаццаць дзён далі салдатам на адаптацыю да новых кліматычных умоў, жыцця пад палячым сонцам у палатачным гарадку, знаёмства з аднапалчанамі. А потым пачалася сапраўдная нялёгкая служба. Байцы выконвалі задачы, якія ставіла перад імі ваеннае камандаванне, удзельнічалі ў баявых аперацыях, суправаджалі калоны. Так праходзілі звычайныя ваенныя будні.

У той час, па словах Часлава Ленскага, савецкія войскі кантралявалі ужо 15 % тэрыторы кабульскай даліны, сам горад Кабул. Чаславу разам з саслужыўцамі даводзілася днём патруляваць па горадзе, ноччу – правяраць пасты. Іх часць ахоўвала таксама кабульскі аэрапорт, суправаджала калоны. Нярэдка і яму даводзілася бачыць, як расстрэльвалі калоны, як гарэлі КАМАЗы.

– Гэта няпраўда, што да вайны можна прывыкнуць, – кажа Часлаў. – Кожнае здарэнне, кожная смерць – гэта стрэс, трагедыя, асабліва, калі гінуць сябры, якім, як і табе, 20 гадоў. А улічваючы, што Ч. Ленскі ахоўваў аэрапорт, то даводзілася бачыць і грузы, якія адтуль адпраўляліся. «Чорнымі цюльпанамі» называлі труны з целамі забітых, грузам «200» абазначалі груз з наяўнасцю трупа, а «300» – з параненым ваеннаслужачым. Амаль кожны дзень з аэрапорта такія адпраўляліся ў Савецкі Саюз.

У Афганістане былі распаўсюджаны такія хваробы, як тыф, гепатыт, дызентэрыя. Змагацца з хваробай у складаных ваенных умовах было цяжка. Таму хворых адпраўлялі лячыцца на радзіму. Праз гэта прайшоў і Часлаў. А пасля выздараўлення зноў вярнуўся на службу.

Як і кожны салдат, Ч. Ленскі пісаў дамоў пісьмы, праўда, яны ніяк не адлюстроўвалі таго, што было на самай справе. «Служба праходзіць нармальна. Жывы, здаровы», – у асноўным такімі нешматслоўнымі былі лісты, але і іх родныя атрымлівалі адзін раз у месяц.

Вяртанне дамоў 1 мая 1982 года было вельмі чаканым і радасным, а планы на жыццё – грандыёзнымі. Паступіў і паспяхова закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут, ваенна-спартыўную кафедру. З 1988 года Часлаў Ленскі працуе выкладчыкам фізвыхавання ў Відзаўскім каледжы. Ён вучыць сваіх падапечных не толькі фізічнай загартоўцы, але і выхоўвае ў іх характарах цярпенне, вынослівасць.

Навучэнцы каледжа – пастаянныя ўдзельнікі розных спартыўных мерапрыемстваў, маюць шмат узнагарод за прызавыя месцы.

Часлаў не любіць успамінаць пра Афганістан. Але ён, безумоўна, пакінуў там частінку свайго жыцця. Засталіся ў памяці афганскія горы, баявыя сябры, з многімі з якіх і сёння падтрымлівае сувязь, узаемавыручка, мужчынская дружба. Прызнаецца, што навучыўся многае успрымаць інакш, даражыць тым, што ў паўсядзённым жыцці здаецца звычайным, а ў экстрэмальнай сітуацыі набывае каштоўнасць. Той жа глыток вады у фляжцы, ім, апошнім, неаднойчы даводзілася ў Афганістане дзяліцца з сябрамі.

***Зінаіда Палулех***

***Фота аўтара***